АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

ФАБРЫКА СЬМЕРЦІ

З ЖЫЦЬЦЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК —— 1929

Закаэ 200. 2.000 экз. Галоўлітбел 990.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выд-ва.

ФАБРЫКА СЬМЕРЦІ.

Краіна родная! Дарогі крыжавыя!
Скажэце гоманам нахмураных прысад:
— Глумілі нас фэльдфэбалі Расіі,
як быццам поле ў буру буйны град.

Дарыла торбы нам, жабрачыя дарыла
„культура“ чорная разьюшаных баяр.
На струны з нас зьдзіралі нашы жылы,
смакталі кроў памешчык і жандар.

Сьвету яснага ня бачыў край вякамі,
грудзі кволыя сьціскаў халодны мур.
Слова роднае закоўвалася ў камень,
народ наш знаў: турму і сьмертны шнур.

Прайшлі гады... Народ з няволі вышаў.
Жыцьцё інакшае спаткала Беларусь.
Але мы помнім, помнім—на Лукішках
быў павешаны адважны наш Кастусь.

І сёньня... там... у заграгічных ботах
жандары-найміты крываваю разьнёй
нашых змучаных братоў за польскі „злоты“
зьвярына катуюць, накінуўшыс грунём.

Зарасьлі былі сьляды баяр праклятых,
загінуў бляск фэльдфэбальскіх пагон.
А сёньня... там... будуюць казематы!
А сёньня... там... няведамы прыгон!

Па сьпінах мужыкоў ангельскі сьвішча шомпал,
гуляе паншчына—нікчэмны чорнацьвет.
Чаго-ж маўчыць культурная Эўропа?
Крык зьняволеных даносіцца ў сусьвет.

Зноў Лукіскіх камер не хапае,
зноў шляхі афарбавала кроў...
Што-ж паноў разьюшаных стрымае?
Правіць турмамі Пілсудзкі-Мураўёў.

Але шляхі адважнага змаганьня
ня змые паншчына кіпучаю крывёй.
Надыйдзе новае, агністае сьвітаньне
Сярпа і Молата над Злучанай Зямлёй.

...Краіна родная! Дарогі крыжавыя!
Гудзеце гоманам нахмураных прысад:
— Польшча сёньня, як царская Расія,
краіна сьмерці... Краіна цёмных крат!

БЕЛАРУСКАЯ МАРСЭЛЬЕЗА.

На процэсе Беларускай сялянска-работніцкай Грамады ў Вільні абаронца Сьмяроўскі, руйнуючы тэзісы пракуратуры аб змове, якая нібы-та была ў грамадаўцаў сказаў:

— „Магчыма, змова была ў тым. што сьпявалі беларускі гімн. Прокуроры кажуць, што ў гэтым гімне ёсьць вострыя і цьвёрдыя словы“.

(„Савецкая Беларусь“, 13 травеня 1928 г).

Сілу забраўшы, параніўшы грудзі,
родную мову імкнуцца забраць.
— „Сьмяюцца над намі багатыя людзі,
здаецца, панамі іх звацьˮ.

Сьмяюцца—загнаўшы працоўных за краты,
сьмяюцца—да сьлёз над бядой галыцьбы.
Знаем мы—блізяцца штурмы расплаты—
віхры ліхой барацьбы.

— „Што трэба свабоды, зямлі чалавеку“,
чуеш, гучыць над зямлёю, як гром?
Досыць... Даволі! Мы спалі адвеку...
Запалім-жа сэрца агнём.

Бяз хлеба, бяз грошай, нібы ў бездарожжы,
усюды ганяюць, сьмяюцца і кпяць.
— „Мы доўга цярпелі, цярпець больш ня
можам,
дык пойдзем мы долі шукаць“.

Дык пойдзем, здабудзем агнём і мячамі...
Гэй, Беларусь, мы здабудзем, гэй!
— „Хай нас сустрэнуць палямі, лясамі
Грамады працоўных людзей“.

Час той настане, адкінем абрэзы
і судзьдзямі будзем, ня шляхта, а мы.
І родныя словы сваёй марсэльезы
з гордасьцю выйдуць з турмы!..

ПАНСКІ ПАДАРУНАК.

(Да прысуду над „Грамадой“).

І ляціць бязьмежжам
вецер, як на крыльлях.
— Межы, толькі межы
думкі засланілі.

Там забралі права
думаць, толькі думаць!
Чорная расправа—
панскі падарунак.

З панскага абліччу
дай сарвем завесу,—
колькі там налічым
жудасных працэсаў.

Чую крык нястрымны
полем і лясамі:
лепшы сын краіны
сёньня катаржанін.

Ляскаюць кайданы
ў катаргу магнаты,
люд закатаваны
гоняць з казэматаў.

Знаем мы, ў палацах
крыецца яднаньне
майстраў провокацый,
лютасьці й выгнаньня.

Толькі дзеці працы
сёл, мястэчак, местаў
сілай дэмонстрацый
шлюць свае протэсты.

Хай гучыць нястрымна
глеба пад нагамі:
лепшы сын краіны
сёньня катаржанін.

Хай разьлёгся вужам
дрот, радзіўшы стогны.
Але не, ня здужаць
Беларусь мільёнаў.

Чую я заўсёды
чую й ня дзіўлюся—
ўзойдзе й там пагода
Савецкай Беларусі.

НАДЫЙДЗЕ ЯШЧЭ ЗАВІРУХА...

Эх, беларуская вёска,
бедная вёска, ня плач.
Няхай п'яная паншчына госкае,
няхай скача крывёю імгла.

Ты ня плач... Іх сіла тлее.
Ты ўзыходзіш на вольны шлях!
Руньню новай ўжо зелянее
Беларусі Заходняй зямля.

І вядома,—яшчэ больш пазнаюць
край, дзе толькі адны крыжы,—
гэта край—Беларусь маладая,
ім ня зьнішчыць яе!

Будзе жыць!

Ня плач ты, забранае поле,
весялейшы кідай перазвон.
Прынясе вызваленьне падпольле—
яно—жыцьцё новых дзён!

Срабрыстаю ночкай паслухай —
ня плача жыцьцё, а бурліць.
Ой, завые яшчэ завіруха —
вызваленьне закутай зямлі.

*

У хаце холадна, у хаце цёмна.
Ня жыцьцё, а ігрышча бяды.
Мы й ня жывем,—
а страшаць жыцьцём нас...
Эх, не прападзем,
як у хмарах дым!

Нас мільёны.
Зьмена наша:
партызанскі бор, завод.
Мы нязломны!
Нам ня страшны
ажырэлы панскі род.

Пераможам
сілай працы.
Ня стрыножыць
дух юнацкі.

Беларусь ня церпіць пана,
Беларусь бунтарскі род.
Эх, паўстане край забраны,
дзеці працы—наш народ.

Срабрыстаю ноччу паслухай —
ня плача жыцьцё, а бурліць.
Эх, надыйдзе яшчэ завіруха—
вызваленьне роднай зямлі.

ТАВАРЫШЫ, З НАМІ ВЯСНА.

Стройся колёнай, жалезная сіла,
чуеш фабрычны гудок?
— З намі вясна! Уздымам шматкрылым
сэрца гаручае запаланіла
як-бы электрычны ток.
З намі вясна! Таварышы, з намі!
Рукі прасьцерла праменьнем жыцьця;
сонцам шматструнным
прадвесьняй Комуны
зьвіла пераможны Чырвоны сьцяг.
Колькі запалу, адвагі і веры
крыецца ў сіле рабочых колён.
Валамі шторму
рушацца ўперад,
на бой заклікае
змаганьня закон.
Бяз страху—
жыцьцё аддавалі на плаху.
Бяз страху, бяз жалю
змаганьне вялі.
Ворагаў білі размахам
напорным,

шляхам прасторным
наперад ішлі.
Славу здабытую дзён пераможных
стальлю гартуе фабрычны варстат.
А думкі крыляцца, імкнуцца трывожна
ў краіну, дзе голад, дзе тысячы крат.
У краіну разьюшанай банды магнатаў,
дзе прагнуць, каб зьнішчыць, бясьсьледна,
на звод
прадажныя людзі: жандар, провокатар —
на суд вядучы беларускі народ.
Таварышы, гэй!
Народ беларускі!
Хай разгараецца прозалаць зор.
Гнеў чалавека, напружыўшы мускул,
судзьдзям напіша агнём прыгавор.
Магнаты, баяры, усе —
бязумоўна
гнуцца ў паклон залатому рублю.
Рвуць скарыстаць, каб суцішыць працоўных,
аэро, гідро —
ваду і зямлю.
І вырваць мову!
І вырваць рукі.—
Хто,
якой сілай
краіну сагне?
— Дый не!
Ніколі!
Адны пагудкі.

Ня вырвуць мову!
Ніколі! Не!
Таварышы, гэй! Заўсёды адважна,
каб толькі...
Бяз панікі, ўперад, угрунь!
На полі, на бруку
загінем, паляжам,
адно ўсё-ж запалім
ў відалях
зару.
Думкі, як іскры, ружовым сьвітаньнем,
думкі, як іскры, асьвечваюць шлях.
— З намі вясна!
— Таварышы, з намі!
— Не выпушчайце чырвоны сьцяг!

ПАЎСТАНЦЫ.

Поэма.

Дзея адбываецца ў Заходняй Беларусі. Малады сасоньнік. Ноч. Цёмна. Чуецца бадзёры голас-кліч:

Б'юць званы новых дзён,
гэй, бедната, слухай!

Надыходзе час помсты,
паўстаць надыходзе час.
Помсту шрапнэляю востраЙ
Кідай паном з пляча.

Ня плач сьлязою цноты,
ня згінайся ў пояс бядзе.
Беларусь—не стаячае балота,
У Беларусі—ня ў ціхай вадзе!

Выходзь з падвалаў падпольле
на вольны, здабыты шлях.
Уздыхне размахам прывольля
Беларусі Заходняй зямля.

Сялянін—выходзь з сякерай,
рабочы—молат бяры.
Узламайце скаваныя дзьверы—
там чырвань новай зары.

Уздымайце агнём завіруху—
у полымі згіне прыгон.
Гэй, бедната, слухай!
— Б'юць званы новых дзён!

Голас змаўкае. Зьяўляецца сьвет: уніве палае вогнішча-кась-цёр. Сасоньнік. На ўзгорку сядзяць вясковыя хлопцы. Высокі стройны хлапец—Ігнат, з чорствым, але выразным тварам—ён атаман моладзі.

ІГНАТ.

І так, хлопцы, толькі сьмела,
празьвініць і наш удар.
Панаваньне банды белай
зьнясе агонь—нібы вада!

Ня вечна плакаць за сахою,
ня вечна нам цярпець прыгон.
Ім не зраўняцца з сілай маладою,—
а гэтай сілы—не адзін мільён.

Сонца кроўю налілося,
над голай вёскаю, —
як жырны пан дрыжыць.
Там! На Меншчыне —
зьвіняць калосься,
у нас дзе глянь —
адны крыжы.

2-гі ХЛАПЕЦ.

Ты працуеш, пот ліецца,
пан здаволены сьмяецца,
раптам штось не спадабае
і цябе тут—сына працы

зазаве ў свае палацы,
бізуном цябе зьбівае,—
сябе й жонку забаўляе...

ІГНАТ.

Так, браты, крывавыя забавы,
такіх забаў даўно ня бачыў сьвет...
Услухайся, гудуць сталетнія дубравы,
дый маладняк гудзіць—да барацьбы заве.
Не! Не ўстаяць ім перад сілай працы!
Не абароніць іх „усемагутны бог“.
Прыгнечаныя ўсе на дэмонстрацыю —
На апошні—сьмела ў бой!
Прыдзе к нам дзень новага жыцьця,
і ўтворыць новую вялікую пару,
ўзьвіецца наш—чырвоны сьцяг,
і аб'яднае Беларусь!

3-ці ХЛАПЕЦ.

Калісьці казкі нам казалі,
што пан людзей кідаў на гандаль.
Цяпер мы гэта самі бачым—
гандлюе намі паноў банда.

ІГНАТ.

Ты, Якім, уладзь з аружжам,
заўтра ўздрогнецца зямля!

4-ты ХЛАПЕЦ.

Калі праца пойдзе дружна!

3-ці ХЛАПЕЦ.

Барацьбе шырокі шлях!

ІГНАТ.

Заўтра па ўсёй Беларусі
ўсе, як адзін атрад.

2-гі ХЛАПЕЦ.

Пачынаюць!

ІГНАТ.

І ў гэтай завірусе
нам трэба ўсё, што ёсьць, забраць...

4-ты ХЛАПЕЦ.

Калі сяляне пойдуць з намі...

2-гі ХЛАПЕЦ.

Сяляне будуць!

ГАЛАСЫ.

Пераможам!

4-ты ХЛАПЕЦ.

Няхай жыве чырвоны сьцяг!

3-ці ХЛАПЕЦ.

Беларусь ім ня стрыножыць!

4-ты ХЛАПЕЦ.

Выйдзем!

2-гі ХЛАПЕЦ.

На пераможны шлях!

ІГНАТ.

У нас яшчэ адно пытаньне,
дзе назначыць заўтра збор?

3-ці ХЛАПЕЦ.

Заўтра збор у нас ня ў тайне,
дык спаткацца ля Трох Гор.

ІГНАТ.

І адтуль, сабраўшы сілу,
Толькі сьмела!

3-ці ХЛАПЕЦ.

Ня спужаць!

4-ты ХЛАПЕЦ.

Возьмем пана мы на вілы!

2-гі ХЛАПЕЦ.

Нам нястрашна ваяваць!

Сьвет зьнікае... Паступова зьяўляецца зноў.

*
* *

Той-жа сасоньнік. Сонца кідаецца ўвечар. На ўзгорку сядзіць панскі пастух Тадэуш, а ля яго ў зеляніне сьпіць няпрытомны селянін. Тадэуш абвешаны пастуховымі прыладамі.

ТАДЭУШ (глядзіць на селяніна).

Сьпіць бядак... Такая наша доля!..
Ня змог ліхой бяды стрываць!

„Канаркі“ яго сына шомпалам餐 паролі,
язык скрывавілі і змусілі сьпяваць.
Пасьля паапякалі маладыя пяты:
— ну, танцуй, хлопаку,—той раве ў іспуг...
Ой, ня раз паляк той дый прыкладам катнуў,
Ня стрымаў—ня вынес—выпусьціў свой дух.
Бацька змучаны, ну вось і стаў вар‘ятам,
як лясун блукае ў гэтым вось ляску.
Жалю ня было-б, каб быў ён пан багаты—
але, адна-ж галота, вецер у таку.

СЕЛЯНІН (спрасоньня).
О, не-не-не! Яго вы не забілі,
ён сам, ён сам памерці захацеў...

ТАДЭУШ.
Заўчора і каваль ад панскае прынукі
пабіты, змучаны у хату прыдыбаў.
І ўвечары злажыў худыя свае рукі—
і дужы быў, і ўсёткі ня стрымаў.
Адно вось моладзь з чырвані істужкі
ўзьдзене, кажучы—„для новага жыцьця“...
Паніч аднойчы мне: „лаві ты іх, як птушак,
і станеш мне, як роднае дзіця“.
Але стары я ўжо, а ўсёткі сэрца маю,
і здраднікам з пракон вякоў ня быў!..
Цяпер ужо і песень не сьпяваю,
ня любы мне і крык маёй трубы...

(Пазлядае на Захад).

Э-э... тут ужо і сонца за гару сядае...

(Устае).

Паганю скаціну... хай паўзе дамоў...
А у вёсцы, пэўна, навіна чакае,
ня было і дня, каб ня лілася кроў.
О, крывавыя паны разводзяць штукі,
каб расказаць—ня стане ў сэрцы слоў:
Гарачае жалеза суне табе ў рукі,
тут табе дзяўчына і гуляй ў любоў...

(Ківаючы галавой, ідзе на выган).

* * *

Трымаючыся за рукі, уваходзяць паніч Людовік і яго паненка Марына.

ЛЮДОВІК.

Вось толькі тут,
вось толькі тут з табою
я чую, як ніколі, спакайней сябе...
Прыгожы кут!
У вечным супакоі
нявольна забываешся аб дзікай барацьбе.

МАРЫНА (упіваючыся захадам сонца).

Якое хараство, павольна дзень зьнікае,
Людовік, глянь, які цудоўны ўзор!

ЛЮДОВІК (нібы злосна).

Заўсёды ўвечары на зоры паглядае
хамства адзічэлае, выходзячы на двор.
Хадзем, Марына, сядзем тут на ўзгорку,
будзем выглядаць, як месяц усплыве...
Разам адшукаем свайго шчасьця зорку.

МАРЫНА.

Разам будзем слухаць, як стары бор пяе...

ЛЮДОВІК.

Разам, толькі разам, праз усе хвіліны
нашых дзён!

МАРЫНА.

Ці будзе толькі час?

ЛЮДОВІК.

Будзе і вялікі! О, мая Марына,
слугі верныя дадуць нам, праца іх для нас!

МАРЫНА.

Ты надзвычайна дзіўны, пэўны ўжо праз меру.

ЛЮДОВІК.

Думаеш, што шчасьце разаб‘юць нам басякі?

МАРЫНА.

Ня думаю, але... я веру і ня веру...

ЛЮДОВІК.

Разьбіць жыцьцё? Патвойму, разьбіць вякі?
Марына, не чакаў... Мы будзем жыць шчасьліва.
Ты глянь кругом—гэта-ж усё тваё!

МАРЫНА.

Заўсёды, дзень у дзень будзе бурлівым,
а знача, так і праз усё жыцьцё...

ЛЮДОВІК.

Цяпер я зразумеў... Марына, у дзень шлюбу
прымушу я сваіх прысягу табе даць.
Ты думаеш, што я дрыжу, баюся згубы,
Марына, я гатоў хоць сёньняваяваць.
Салдаты—слугі мне, і толькі адно слова—
сьмерць лютую глынуць бунтаўшчыкі.
І гэты будзе дзень, рашучы дзень, суровы,
ня будуць больш парогі біць і енчыць мужыкі...
Марына, бачу я—ты не даеш мне веры?
Вось зараз ніцма ляжа вёска прад табой.
Даволі ўжо цярпеў, даволі ўжо, праз меру,
Адна хвіліна! І толькі я з табой!

МАРЫНА.

Чакай!.. Хадзем адсюль зусім мы,
туды, дзе возера палошча берагі.
Настрой такі ў мяне, я толькі так, любімы,
да сьмерці будзем разам, Людвік, дарагі...

(Прытуліліся і галубяцца).

* * *

Селянін, прабудзіўшыся, узьняў галаву і баязьлівым голасам нібы просіцца:

О, не-не-не!.. яго вы не забілі,
ён сам, ён сам памерці захацеў...

МАРЫНА (спалохаўшыся).

Хто ён? Адкуль?

(Чуецца ціхі сьпеў дзяўчат).

СЕЛЯНІН.

А глуха бор шумеў...

МАРЫНА.

Цудоўны чалавек!..

ЛЮДОВІК.

Пакіньма, бачыш, звар'яцеў.
А там ужо, вось чуеш, песьні, хоць
праз сьлёзы.
Не! я ня стрываю, мушу іх спыніць.

МАРЫНА.

Пойдзем! Там ля возера шапочуць
вербалозы,
будзем там за месячыкам, зоркамі
сачыць.

(Пашлі).

СЕЛЯНІН (павольна становячыся на ногі).

Русалачкі вадзілі...
Ножкі цалаваў іх...
Надмагільны сьпеў...
...Нажамі...

(Баязьліва спыняюцца).

Не, ён сам,
ён сам памерці захацеў...
А шалясьцела сенажаць...
Дождж біў градам...
Во... званы хаўтурныя зьвіняць...
паны зьбіраюцца... Нарада...
...Народ ідзе... павесялеў...

нажамі...
Не, ён сам,
ён сам памерці захацеў...

* * *

Пяючы сумную песьню. паволька ўваходзяць чатыры дзяўчыны, але, угледзеўшы селяніна, зараз-жа перастаюць пяяць.

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Бедны, як любіў ён, як любіў ён сына,
працаваў, вучыцца можнасьць яму даў...

2-я ДЗЯЎЧЫНА (пра сябе).

Быў такі прыгожы... і адна хвіліна,
ад рукі няволі цяжка так сканаў.

(Падыходзіць да селяніна, прыгладжвае яму галаву, папраўляе вопратку. Селянін баязьліва адмахваецца рукамі з словамі: „Не, ён сам, ён сам...“ Дзяўчына яго супакойвае і незадоўга разам з ім выходзіць).

3-я ДЗЯЎЧЫНА (задуменная,. на твары відаць прыбітасьць настрою).

Эх, ты, доля-доля...

1-я ДЗЯЎЧЫНА (глядзіць на селяніна, якога 2-я дзяўчына выводзіць).

Помста за цябе—затопіць у крыві...

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Цяжкі крыж!.. прыдзі, прыдзі ты, воля,
прыдзі, і хоць хвілінку з намі пажыві...

4-я ДЗЯЎЧЫНА.

Калі уцёк туды Васіль Пятроў з Рыгорам,
па іх сьлядох хацела бегчы я...

Але пашла-б, у хаце, шчэ больш гора!
Я засталася... а віна-ж чыя?

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

У той-жа дзень Сымонаву Ганулю
прыехаўшы салдаты згубілі... на век...
О, цяжкі крыж...

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

У ланцугі закулі,
жывёлай стаў няшчасны чалавек.
Ня веру я, каб так і засталося,
сягоньня, заўтра згіне гэты дым.

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Жыві і спадзявайся...

4-я ДЗЯЎЧЫНА.

Няўжо так давялося
нявольнікамі быць!

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

О, прыдзе воля ўсім!

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Хадзем, дзяўчаты, вечарам блукацца,
хто ведае... а дома працы яшчэ шмат.

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Навошта жыць, калі усе баяцца!

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Ты сьмелая, а вось каб тут убачыў кат?

4-я ДЗЯЎЧЫНА.

Аксана пашла з Янам,
бедная дзяўчына!
Разьбілі шчасьце...

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Як ён яе любіў!..
Жыцьцё, жыцьцё адна толькі хвіліна.

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Улан той чарнамазы, ці аднаго згубіў?
І хлопцы нашы бедныя, да званьня
з сіл выбіліся...

4-я ДЗЯЎЧЫНА.

Што цяпер пачаць?

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Вялікае паставілі заданьнем!

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Ці хопіць бедным сіл?

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Даволі ўжо трываць!

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Хадзем...

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Чаго? Як і заўсёды цябе у хаце знойдзе,
калі ён захоча, тут лепш пасядзім.
А тады праз поплаў, валам ціха пройдзем.

4-я ДЗЯЎЧЫНА.

Дык давайце песьню...
Бо сумна штось адным...

(Павольна пяюць песьню-трыо; адчуваецца глыбокі сум-няволя).

За жнівом у полі,
праца сьлёзы лье.
А мая няволя
песьню мне пяе.
Эх, сьпявай, няволя,
весялей сьпявай!
Мо' убачыць волю
наш забраны край.
Ой, гудзі дубрава,
вечар, ты сьпявай.
Церпіць баль крывавы
наш забраны край.
Эх, няволя-пане,
Ой, пакінь мяне!
Новы дзень настане
ў нашай старане.

(Раптам чуецца далёкі гоман-выкрык).

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Чакайце, што гэта за крык?

1-я ДЗЯЎЧЫНА.

Бяжыць, здаецца, хтосьці?!

3-я ДЗЯЎЧЫНА (перапалохаўшыся).

Слуга! Дзяўчаты, уцякаць!

4-я ДЗЯЎЧЫНА.

Горай будзе...

3-я ДЗЯЎЧЫНА.

Горай... паломіць нашы косьці.
Як хочаце...

* * *

(Мкнецца бегчы, яе затрымлівае панскі слуга, які прыбег, каб папярэдзіць Людовіка).

ПАНСКІ СЛУГА (да дзяўчат).

Чаго за панствам выглядаць?
Дык дзе, ў якім баку?... Тут справа не да кпінаў!
Хутчэй кажэце!

(Трасе бізуном).

ДЗЯЎЧАТЫ.

Ня бачылі, мы толькі тут хвіліну...

ПАНСКІ СЛУГА (іронічна).

Ня бачылі... Хвіліну...

(Сурова).

Ён тут даўно гуляе!
Кажэце! Бо зараз кінеце свой кут,
у сьвет шырокі з торбамі...

(Да 1-й дзяўчыны).

Дзе пан, цябе пытаю?

(Імкнецца яе ўдарыць бізуном).

* * *

Раптам убягае хлапец, які гнаўся за ім.

ІГНАТ (да панскага слугі).

Наважыўся ўцякаць?

(Кідае голас у той бок, адкуль прыбег).

Гэй, хлопцы, цівун тут!..

(Да панскага слугі).

Ты што надумаў, да пана іх?
Скаціна!
Апошні раз зірні на шумны сьвет...
Агонь палац глытае, табе трэба дзяўчына?
На споведзі мо' хочаш?

СЛУГА (хапаецца за рукі хлапца).

Пусьці, браток...

ІГНАТ (злосна).

Ні слова, гад!..

ДЗЯЎЧАТЫ.

Што здарылася?

ІГНАТ (цьвёрда).

Воля загуляла!

(Убягае грамада хлапцоў).

1-шы ХЛАПЕЦ (паказваючы на панскага слугу).

Давай яго сюды, мы зладзім самі з ім!

2-гі ХЛАПЕЦ.

Хоць і муры, а полымя гуляе...

3-ці ХЛАПЕЦ.

Як хмара, так плыве навалай чорны дым.

ІГНАТ (да панскага слугі).

Дзе пан?

ПАНСКІ СЛУГА (мякка).

Ня ведаю, куды яго загнала...

ХЛОПЦЫ.

Забіць прыхвосьніка! Забіць!

(Уваходзяць стрывожаныя Людовік і Марына).

ЛЮДОВІК.

Што тут за дзікі крык?

ПАНСКІ СЛУГА (схаваўся за Людовіка і з-за сьпіны яго).

О, пан, та псярня ўзбунтавала!

ІГНАТ.

Паўстаў нявольнік твой, мужык!

ЛЮДОВІК.

Салдаты дзе?

ПАНСКІ СЛУГА.

Ня ведаю...

ІГНАТ (паказаў хлапцом на панскага слугу).

Бяры яго!

ЛЮДОВІК (даў крок уперад і яшчэ захацеў пакарыстацца сваім загадам).

Дамоў!.. Хутчэй!..

ІГНАТ (падышоўшы да Людовіка).

Над намі ты ўжо не ўладар!

(Хлопцы хватаюць Людовіка і Марыну).

ІГНАТ.

Пусьці яго, хай гляне, як агонь гуляе!

ЛЮДОВІК.

Вы—слугі мне, і як?

ІГНАТ.

Я—твой слуга і на цябе вайною
хадзем, хто зможа!

(Ігнат цягне яго на сярэдзіну).

МАРЫНА.

О, божа, зьлітуйся!..

ХЛОПЦЫ.

Забіць яго! Забіць! Даволі тут...
Забіць! У агонь яго! Сьмерць! Даволі тут...
Забіць...

З шумам-гоманам хватаюць паноў. Гасьне сьвет. Ціш. Зноў чуцен голас-кліч.

Б'юць званы новых дзён!
Гэй, бедната, слухай!

Голас зьнікае. Зьяўляецца сьвет... Прыгожы сонечны дзень. На сярэдзіне стаіць Беларусь з сьцягам волі ў руцэ.

Кавалкі кайданоў вісяць на яе руках. З аднаго і другога боку два радасныя хлопчыкі—Захад і Ўсход працягваюць свае рукі к сьцягу волі. Чуецца песьня перамогі:

„Ад веку мы спалі"...

ЗЬМЕСТ